УДК 811.161.3-057.875

# РОЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНТАЎ

**Л. У. Селібірава**
*Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія,*
*Горкі, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжаны розныя віды заданняў, што выкарыстоўваюцца на занятках выкладчыкамі беларускай мовы з мэтай патрыятычнага выхавання моладзі.

**Ключавыя словы:** беларуская мова, патрыятызм, любоў да радзімы, выхаванне, родная краіна, стваральная дзейнасць.

Патрыятызм – гэта адна з лепшых рыс, уласцівых чалавеку. Сутнасць патрыятызму тлумачыцца ў розных крыніцах па-рознаму. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» прадстаўлена наступная дэфініцыя лексемы: «Патрыятызм – любоў да радзімы, адданасць сваёй бацькаўшчыне, свайму народу» [1, Т. 4, с. 108]. Такім чынам, патрыятызм выяўляецца ў стваральнай дзейнасці, накіраванай на карысць краіны.

Як вядома, пачуццё любові да радзімы не з’яўляецца прыроджаным, яно фарміруецца карпатлівай, удумлівай і зладжанай працай грамадства і дзяржавы, павагай да гісторыі, разуменнем ролі Беларусі ў сучасным свеце. Прывіць стваральную любоў да роднай зямлі – галоўны сэнс выхавання, адукацыі, ідэалагічнай палітыкі нашай краіны.

Безумоўна, глыбіннасць патрыятызму закладваецца перш за ўсё ў сям’і – праз сямейныя традыцыі, святы, перадачу вопыту і мудрасці ад старэйшага пакалення да малодшага. Патрыятычнае выхаванне працягваецца ў дзіцячым садку, у школе, ва ўніверсітэце.

Трэба адзначыць, што сёння адным з асноўных напрамкаў развіцця вышэйшай школы з’яўляецца ўзмацненне выхавання ў духу патрыятызму. Такім чынам, на выкладчыка вышэйшых навучальных устаноў кладзецца вялікая адказнасць за фарміраванне гэтай рысы. Вялікая роля ў дадзеным кірунку адводзіцца выкладчыку беларускай мовы. Як правіла, выхаванне патрыятызму пачынаецца з паглыбленага пазнання радзімы на канкрэтных прыкладах, а не на абстрактных пачуццях доўгу.

Працу па патрыятычным выхаванні моладзі можна распа–чынацьужо з першых заняткаў беларускай мовы. Напрыклад, даць студэнтам заданне запісаць вядомыя ім прозвішчы і імёны знакамітых людзей Беларусі (асветнікаў, вучоных, мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў і г. д.), пра якіх пазней будуць прагледжаны дакументальныя і мастацкія фільмы, напісаны рэфераты, падрыхтаваны мультымедыйныя прэзентацыі, зроблены вусныя паведамленні.

Адзначым, што выкладчык роднай мовы заўсёды павінен акцэнтаваць увагу навучэнцаў на вельмі важным моманце: кожны беларус абавязаны шанаваць і аберагаць беларускую мову. Яшчэ ў XX стагоддзі беларуская пісьменніца Цётка, звяртаючыся да сваіх сучаснікаў і нашчадкаў, папярэджвала:«Бедны той, хто, апрача грошай, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных – скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, – гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народа, да роднай мовы…» [2]. Бясспрэчна, добра, калі чалавек ведае шмат моў, але найперш неабходна валодаць родным словам.

Падчас працы з лексічным матэрыялам, на наш погляд, мэтазгодна звярнуцца да беларускіх прыказак і прымавак пра любоў да радзімы. Узгадаем некаторыя з іх.

*Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.*

*Усюды добра, а дома лепей.*

*На чужыне і камар загіне.*

*Ад душы працуеш – радзіму шануеш.*

*Кожная сасна свайму бору песню пяе.*

*Няма лепшага раю ад роднага краю.*

*Дадому і конь спрытней бяжыць.*

Можна таксама разгледзець крылатыя словы і афарызмы пра радзіму і родную мову. Прывядзём прыклады.

*Мой родны кут, як ты мне мілы*! (Я. Колас)

*Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі*! (Я. Купала)

*Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб.* (А. Вялюгін)

*Дзе прайшло маленства, там пачынаецца радзіма.* (К. Чорны)

*Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў.* (У. Караткевіч)

*І тчэ, забыўшыся, руказаміж персідскага ўзоруцвяток радзімы васілька.* (М. Багдановіч)

Выклікае цікавасць у студэнтаў наступнае заданне: да рускіх словазлучэнняў падбярыце беларускія безэквівалентныя лексемы: (напрыклад: *колбаса, приготовленная их потрохов* (***вантрабянка***); *приспособление для доставания воды из колодца* (***асвер***); *оладьи или блины из тертого картофеля* (***дранікі***); *приворотное зелье* (***любізнік***); *книжный магазин* (***кнігарня***); *резкий, холодный, колючий ветер* (***вятрыска***); *сухая корка хлеба* (***асушак***); *толстая и длинная игла* (***шаршатка***); *вторые рамы* (***дубэльты***); *перебивая друг друга* (***наўзахапкі***)).

Акрамя таго, можна зрабіць аналіз перыфраз. Прывядзём некалькі прыкладаў: *край блакітных азёр* – Беларусь;*беларуская пальма* – бяроза;*другі хлеб* – бульба; *беларускі шоўк* – лён; *зямля бацькоў* – радзіма; *срэбны званочак* – жаўранак; *беларускае мора* – возера Нарач; *жамчужына роднага краю* – Белавежская пушча.

На нашу думку, на занятках па беларускай мове варта ўключаць і краязнаўчы матэрыял, які стымулюе пошукавую дзейнасць навучэнцаў. Можна, да прыкладу, прапанаваць студэнтам напісаць сачыненне-разважанне, нарыс, апавяданне ці верш на наступныя тэмы:«Назвы роднага краю», «Імёны майго роду», «Адкуль у чалавека імя і што яно азначае?»

У час працы над граматычнымі тэмамі раім выкарыстоўваць наступныя заданні.

Падбярыце сінонімы да дадзеных слоў: *незалежнасць, радзіма, сумленнасць, чалавечнасць, спагада, талерантнасць, васількі, бусел,руплівасць.*

Назавіце антонімы да наступных лексічных адзінак: *свабода, працавітасць, любоў, дабрыня, моц, вернасць, святло, радасць, дабрадушнасць.*

Такім чынам, выкарыстанне на занятках беларускай мовы прапанаваных відаў заданняў будзе садзейнічаць не толькі ўзбагачэнню ведаў моладзі, але і фарміраванню высокіх грамадзянскіх і маральных ідэалаў новага пакалення.

ЛІТАРАТУРА

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т., 6 кн. / пад агул. рэд. К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск: БелСЭ, 1977–1984. – Т. 4. – 768 с.

2. П а ш к е в і ч, А. С. (Цётка). Выбраныя творы / А. С. Пашкевіч (Цётка). – Мінск: Маст. літ., 2016. – 196 с.